## Акцыя "Нашы дзеці"

Акцыя "Нашы дзеці" – мабыць, адна з самых добрых і цёплых перадсвяточных акцый, якая аб'ядноўвае неабыякавых дарослых. Напярэдадні самых любімых усімі святаў – Новага года і Калядаў да дзяцей-інвалідаў з падарункамі і віншаваннямі прыйшлі спецыялісты аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" сумесна з Ашмянскай раённай арганізацыяй грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў", а таксама Снягуркай, якая павіншавала дзяцей са святам, падарыла навагодні настрой і ўручыла падарункі.








